**XVI ФЕСТЫВАЛЬ ДУХОЎНАЙ МУЗЫКІ**

# ЗАЛАТАГОРСКАЯ ЛІРА

***Касцёл Найсвяцейшай Тройцы (святога Роха)***
***на Залатой Горцы ў Мінску***
*10-26.04.2021*

**17 КРАСАВІКА 2021, СУБОТА, 20:00**
**ВЕЧАР БЕЛАРУСКАЙ ДУХОЎНАЙ МУЗЫКІ**

# МУЗЫКА БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ – ПАКАЛЕННЮ XXI СТАГОДДЗЯ



**Харавы ансамбль сучаснай музыкі**

# CONCERTINO

**Беларускага саюза кампазітараў**

Мастацкі кіраўнік і дырыжор – **Аляксей Снітко**

Харавы ансамбль «Concertino» Беларускага саюза кампазітараў – лаўрэат міжнародных конкурсаў, уладальнік заахвочвальнай прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Гісторыя ансамбля вядзе пачатак з заснавання камернага хору «Concertino» ў 2009 годзе на базе Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. І. Глінкі пад кіраўніцтвам выпускніка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, магістра мастацтвазнаўства Аляксея Іванавіча Снітко.

Калектыў неаднаразова станавіўся лаўрэатам у міжнародных конкурсах і фестывалях камернай і духоўнай музыкі, такіх, як «Рэха» ў Мінску (2013 года), «Гайнаўка-2015» у Беластоку, «Рэ-Ліга» ў Санкт-Пецярбургу (2018), прымаў удзел у праектах: «Да вяршыняў творчасці», у харавым варштаце НТО «Facultatis», у Рэспубліканскім семінары-практыкуме па харавым спеве, у аўтарскім канцэрце Яўгена Паплаўскага «Спрадвечнае Святло», выступаў з канцэртамі ў Кракаўскай акадэміі музыкі і Пазнанскай акадэміі музыкі імя І. Падэрэўскага (Польшча).

Важныя старонкі ў творчай біяграфіі калектыву – супрацоўніцтва з такімі таленавітымі дырыжорамі, як Dirkjan Horringa (Нідэрланды), Уладзімір Семянюк (Расія), Пётр Вандзілоўскі (Беларусь), Вальтэр Мік (Германія).

У чэрвені 2019 года калектыў трансфармаваўся ў харавы ансамбль і стаў структурным падраздзяленнем грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў». Мэта дзейнасці калектыву – папулярызацыя музыкі беларускіх кампазітараў, знаёмства слухачоў з узорамі харавой музыкі рускіх і замежных кампазітараў.

ПРАГРАМА:

1. Ігар Янкоўскі (нар. 1983) – «Gloria».
2. Ігар Янкоўскі, сл. Максіма Багдановіча (1891-1917) – «Слабне золак».
3. Вацлаў з Шамотул (прыбл. 1520-1560) – «Алелюя, слаўце Пана Бога».
4. Яўген Паплаўскі (нар. 1959) – «Gloria Patri» з цыкла «Малітвы» для жаночага хору без суправаджэння (2016).
5. Віктар Кісцень (нар. 1977) – «Ойча наш» (2003).
6. Аліна Безенсон (нар. 1971) – «Te Deum» у 4-х частках (2020).
7. Аляксандр Літвіноўскі – «Sanctus», «Benedictus», «Gloria» з Месы (пералажэнне для аргана сола). Выканаўца – Віктар Кісцень (арган).
8. Алена Атрашкевіч (нар. 1966) – «Ave, Maria» (2020).
   Партыя аргана – Марыя Троць.
9. Аляксандр Рашчынскі (1949-2016) – 3 беларускія народныя песні: «Туман-туман, матушка», «З-пад белага камушка», «Ой, там, на гары» (саліст – Яўген Ваўчок).
10. Алена Атрашкевіч – апрацоўка беларускай народнай песні «Купалінка» (сл. народныя, мелодыя Уладзіміра Тэраўскага (1871-1938).
11. Ман. Іуліанія (Ірына Дзянісава) – «Всего-то навсего».
12. Ігар Лучанок (1938-2018), сл. Якуба Коласа – «Мой родны кут».

## БЛІЖЭЙШЫЯ КАНЦЭРТЫ:

**19 КРАСАВІКА 2021, ПАНЯДЗЕЛАК, 20:00**

Хор Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь
**«Музычная капэла „Санорус“ Мінскай вобласці»**
**Галоўны дырыжор – Марына Траццякова**
**Хормайстар – Вольга Пятрова**
**Дырыжор – Святлана Герасімовіч**

**У праграме: І. С. Бах, К. Мантэвердзі, Д. Палестрына, К. Джэзуальда, Ф. Мендэльсон, А. Ясінскі, Е. Янчэўскіс, А. Хадоска**

**24 КРАСАВІКА 2021, СУБОТА, 20:00**

**Дыялог культур: арган і дудук**

**Канцэрт арганнай і камернай музыкі**
**Кацярына Іванова (арган)**
**Глеб Якушаў (дудук)**

**26 КРАСАВІКА 2021, ПАНЯДЗЕЛАК, 20:00**

**Беларускі акцэнт**
**Канцэрт арганнай і камернай музыкі**
**Лізавета Марозава (арган)**
**Ірына Марозава (цымбалы)**

**У праграме: І. С. Бах, А. Вівальдзі, В. Кісцень, В. Падгайская**

**УВАХОД НА ЎСЕ КАНЦЭРТЫ СВАБОДНЫ**
**ДОБРААХВОТНЫЯ АХВЯРАВАННІ**
**МОЖНА СКЛАСЦІ НА ВЫХАДЗЕ З КАСЦЁЛА**